# ЗВОН

Беларуская штодзенная п
тычна-літэратурная часоп
Рукапісы павінны быць
рапісаны чытэльна. А
та прынятых рукапісау
лежыць ад радакцыі. Р
пісы назад не выдаюц
Адрэс рэдакцыі і адміністра
м. Менск, Юбілейны до
Цана нумару 1 марка

№ 21. Менск, Пятніца 10 кастрычніка 19



**На гэтых днех адчыняюцца Беларускіе курсы для настаунікау Меншчыны. Запіс на курсы адбываецца штодня у Беларускай Школьнай Радзе, (Захарауская вул., б. Юбілейны Дом) ад 11—2 гадзін і ад 5—7 у вечары.**

Кіраунічы курсамі *Я. Лесік.*


## Ня маюць прытулку.

Менск—сэрцо Беларусі, яе этнографічная сталіца. Так пішуць у газэтах і так думаюць людзі, каторые жывуць па-за межамі Беларусі. Але мы мусім зазначыць, што гэта памылка і няпрауда, бо хіба можа быць дзе-небудзь на сьвеце, каб сам народ у сваей уласнай сталіцы ня меу сабе прытулку?! А беларусы у Менску ня маюць прытулку. Іх, адвечных гаспадароу гэтага места, выціснулі адусюль, адкуль толькі можна было выціснуць. Беларусам пакінулі толькі право глядзець на тое, як жывуць іншые ды моучкі сьціскаць кулакі, распаляючы у сэрцы помсту.

Была у беларусау настауніцкая сэмінарыя у Менску. Яна перажыла самые цяжкіе часы бальшавізму і усе чакала лепшай долі. Месьцілася яна па Захараускай вуліцы № 43, мела сваю маетнасьць і цэлы штат настаунікау. А гдзе яна цяпер? Маетнасьць яе паразьбіралі сквапные людзі, а памяшканьне занялі тые, хто ужо сапрауды церaз хлеб—хлеба шукае. Паглядзі, чытачу, хто цяпер месьціцца у будынку беларускай сэмінарыі і запытай сябе, ці-ж не маглі яны знайці сабе іншага месца, каб хоць крошку шанавалі той народ, установы каторага павыкідалі на вуліцу?!

Была у Менску беларуская гімназія на Александраускай вуліцы, а паглядзі, чытачу, хто там цяпер месьціцца і запытай сябе, ці-ж не маглі яны знайці сабе лепшага месца, каб не хацелі крыудзіць таго, хто праз вякі зносіць зьдзек і паняверку?!

Быу у Менску Настауніцкі Інстытут, каторы стау вышэйшай пэдагогічнай беларускай школай. Месьціуся ен у скарбовым памяшканьні, дзе была калісь расійская рэальная гімназія, а паглядзі, чытачу, хто цяпер займае тое памяшканьне і запытай сябе, ці-ж не наумысьле усе гэта робіцца, каб спраудзіць словы: „на каго Бог, на таго і людзі“. Ці-ж не маглі яны, маючые сілу і уладу, знайці сабе іншага мейсца, каб хацелі жыць у дружбе і згодзе з тым народам, каторы нацярпеуся столькі гора, сьлез і пакуты?

Не, мімаволі хочацца сказаць, што усе гэта робіцца наумысьля, нарокам і сьвядома чыніцца крыуда і незабываемая абраза. Мабыць нехта сьвядома стараецца усякімі спосабамі змагацца з беларушчынай і ставіць беларусам перашкоды. Бо ня можна, напрыклад, дапусьціць, каб той шпіталь, што займае цяпер памяшканьне інстытуту, зрабіу гэта сам, без парады з некім іншым, хто выкарыстау яго для змаганьня з беларушчынай.

Гэтые тры прасьветные установы беларусы толькі і мелі і яны разрушаны.

Польская улада павінна зьвярнуць на гэта увагу, і, калі яна шануе свайго Дзяржаунага Начальніка, каторы лічыць сябе прыхільнікам і прыяцелем беларушчыны, то мусіць зараз-жа зрабіць станоучые заходы, каб загладзіць прычыненую беларусам у іх уласным горадзе цяжкую крыуду. Польская улада павінна гэта зрабіць, калі мае дзяржауны розум і разумее свае становішчо, бо сталося так, што беларусам пакінулі адно толькі права,—права пазіраць на жыцьце іншых ды моучкі сьціскаць кулакі, распаляючы у сэрцы помсту.

---

## Якіе будуць школы на Меншчыне.

Школьная справа апынулася цяпер у самых дрэнных варунках. Да гэтага часу няма аб рэформе школ ніякіх агульных распараджэньняу. Школа народная вісіць у паветры, і ці будзе распачата навука па вясковых школах праз месяц—няма ведама. Усе стараньне галадаючага настауніцтва ні да чога ня прыводзе, і яшчэ настауніцтво Менскага павету тые ці іншые інформацыі адтрымлівае з Менску і пачынае само арганізовываць сялян, каб уласнай ініцыятывай паставіць беларускую народную школу на моцны грунт, а што датычыць настаунікау з далекіх паветау, то яны ходзяць дома у поуным нязнаньні: калі адчыняцца школы, на якой выкладо-

ваі
нас
хто
шк
нас
ло
з 1
Ігу
Ме
ваі
ску
пол

ста
хат
і у
рад
іст
зар
каб
аб
ска
так
пра
Шк
інс
аб
вес
кау
ход
юць
зы
лей
шы
мов
—з
чы,
нуп
у с

і пр
неп
зум
зго
лар
ла,
мо
бок
вым
лю

лаі
вяд
пра
Менс
толь
скіе
ужо
маю
стау
вауе
родн
вац
наюч
даруск